*Г. Г. Шымелевіч (Мінск),*
*выкладчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

# ВЫВУЧЭННЕ ПОМНІКАЎ ЭКЛЕКТЫКІ, РЭТРАСПЕКТЫВІЗМУ І МАДЭРНУ Ў МЕЖАХ ДЫСЦЫПЛІН ГІСТОРЫКА-МАСТАЦТВАЗНАЎЧАГА ЦЫКЛА

У працэсе вывучэння гісторыі мастацкай культуры важным фактарам, неабходным для засваення навучэнцамі і студэнтамі новых ведаў, з'яўляецца прадуманае, эфектыўнае структураванне матэрыялу. У мастацкай і мастацтвазнаўчай адукацыі агульнапрынята храналагічная структура матэрыялу, падзел інфармацыі на тэматычныя блокі і раздзелы адпаведна гістарычным эпохам. У цэлым гэты падыход з'яўляецца правамерным, аднак часам немэтазгодна прымяняць агульнапрынятую гістарычную перыядызацыю ў дачыненні да працэсаў развіцця розных відаў мастацтва (выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное, архітэктура, музыка і г. д.). Найважнейшыя з'явы і зрухі тут не заўсёды супадаюць храналагічна з сацыяльна-гістарычнымі падзеямі, яны маюць асобую ўнутраную логіку развіцця, і гэта патрабуе спецыфічнага вырашэння праблемы перыядызацыі гісторыі відаў мастацтва. Найбольш прымальна тут вызначэнне гістарычных стыляў і структураванне інфармацыі ў адпаведнасці з храналогіяй змены гэтых стыляў.

Пад стылем сучасная мастацтвазнаўчая навука разумее ўстойлівае адзінства вобразнай сістэмы, сродкаў і прыёмаў мастацкай выразнасці, абумоўленых адзінствам ідэйнага зместу ў адпаведнасці са спецыфікай канкрэтнай гістарычнай сітуацыі[1]. Такім чынам, стыль — даволі універсальная катэгорыя мастацтва, і менавіта на раскрыцці працэсаў гістарычнай змены стыляў педагог можа эфектыўна пабудаваць засваенне мастацкай спадчыны.

У практыцы выкладання дысцыплін гісторыка-мастацтвазнаўчага цыкла ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах мастацтва даўно і стала асвоены аналіз такіх гістарычных стыляў, як раманскі, гатычны, стыль Адраджэння, барока, ракако, класіцызм. Але пры вывучэнні мастацтва XIX—XX стагоддзяў, з уласцівай яму складанай шматстылёвасцю, педагогі рэдка праводзяць глыбокі стылістычны аналіз. Вынікам гэтага стала страта такіх важных фактараў, як усебаковасць і структурная цэласнасць разгляду з'яў мастацтва.

У XIX стагоддзі мастакі, пісьменнікі, крытыкі ўпершыню ўсвядомілі праблему стылю. Пачаліся напружаныя пошукі дасканалых стылістычных форм, прычым гэты працэс адбываўся не стыхійна, як у папярэдніх эпохі, а свядома — не толькі ў мастацкай практыцы, але і ў тэорыі. Гэта спачатку прывяло да часовай перамогі рэтраспектывізму (адвольнага звароту да стылістыкі ранейшых эпох) і эклектыкі (спалучэння рознастылявых элементаў у адным творы). Аднак пазней, пераадолеўшы стылявы крызіс сярэдзіны XIX стагоддзя, мастацтва выпрацавала новы стыль — мадэрн.

Бясспрэчна, што пры вывучэнні гісторыі мастацтва XIX — пачатку

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

XX стагоддзя неабходна ўсебакова разглядаць працэс змены стыляў, яго анацыяльна-гістарычныя перадумовы і мастацка-эстэтычныя прычыны. На жаль, да цяперашняга часу сур'ёзна гэтая задача амаль не вырашаецца. У пераважнай большасці існуючай літаратуры перыяд эклектыкі характарызуецца як час "некрытычнага выкарыстання форм розных стыляў"[2]. Рэтраспектывізм (гістарызм) як мастацкая з'ява яшчэ не атрымаў належнай увагі беларускіх даследчыкаў. Вывучэнне праяў стылю мадэрн у беларускай мастацкай культуры толькі пачынаецца.

У сувязі з гэтым у праграмах вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў мастацтва помнікам эклектыкі, рэтраспектывізму і мадэрну надаецца невялікая ўвага. Паводле "Гісторыі беларускага мастацтва", у XIX стагоддзі "не склалася якога-небудзь адзінага мастацкага напрамку, а пераважалі дробныя плыні рознага плана і арыентацыі"[3]. Але ж пры больш уважлівым разглядзе помнікаў гэтага часу перад намі адкрываюцца унікальныя магчымасці аналізу працэсаў стылеўтварэння ў архітэктуры і дэкаратыўным мастацтве.

Група помнікаў эклектыкі, якія захаваліся на тэрыторыі Беларусі, адносна невялікая (некалькі дзесяткаў). Тым не менш яна ўключае ў сябе такія значныя збудаванні, як палац у в. Прылукі (Мінскі р-н, 1851—1872), сядзібны комплекс у в. Чырвоны Бераг (Жлобінскі р-н, 1890—1893), настаўніцкі інстытут у Магілёве (1848—1853). Разгляд гэтых помнікаў у працэсе вывучэння гісторыі беларускага мастацтва (гісторыі архітэктуры, іншых дысцыплін цыкла) дае магчымасць падкрэсліць важнасць праблемы стылю ў мастацкай культуры XIX стагоддзя. Як лічаць многія даследчыкі, у той час "прадметам асэнсавання і дыскусій, па сутнасці, з'яўлялася адна праблема — праблема стылю"[4]. Пры аналізе помнікаў эклектыкі звяртае на сябе ўвагу высокі прафесійна-мастацкі ўзровень падрыхтоўкі архітэктараў, якія свабодна арыентаваліся ў формах і матывах усіх гістарычных эпох мінулага. На жаль, гэты стандарт прафесійнай падрыхтоўкі ў сучаснай мастацкай адукацыі амаль страчаны.

Самая вялікая па колькасці стылістычная група ў архітэктуры Беларусі XIX стагоддзя — помнікі рэтраспектывізму (гістарызму), пабудовы, якія ў час праектавання былі свядома вырашаны ў формах таго ці іншага гістарычнага стылю. Да нашага часу захаваліся сотні такіх помнікаў. Стылістычна гэтая плынь падзяляецца на некалькі напрамкаў: неаготыку, неараманскую архітэктуру, неабарока, неакласіцызм і рэтраспектыўна-рускі стыль (апошні мае дзве разнавіднасці, так званы афіцыйны "руска-візантыйскі" стыль, выкарыстаны, у тым ліку, для стварэння шматлікіх "тыпавых" праваслаўных храмаў, і "неарускі" — з большай ступенню творчага пераасэнсавання старажытных матываў).

Пры разглядзе гэтай групы помнікаў заўважаецца цікавы факт — існаванне пэўных традыцый выбару таго ці іншага гістарычнага "неастылю" ў залежнасці ад прызначэння (тыпалогіі) збудаванняў. Як адзначаюць гісторыкі архітэктуры, неагатычны напрамак, напрыклад, атрымаў шырокае распаўсюджанне перш за ўсё ў формах сакральных каталіцкіх аб'ектаў, а таксама ў прамысловай архітэктуры, у той час як будынкі банкаў і адміністрацыйных устаноў пераважна маюць прыкметы неакласіцызму.

У працэсе вывучэння помнікаў рэтраспектывізму XIX стагоддзя неабходна звяртаць увагу на тое, што ў іх адлюстравалася вострая ідэалагічная барацьба таго часу. Гісторыкам архі-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

тэктуры вядомы выпадкі, калі пры перадачы храма ад адной канфесіі другой (ад каталікаў — праваслаўным) праводзіліся спецыяльныя рэканструкцыі, пры якіх мянялася стылістыка храмавай архітэктуры[5].

Невялікая, але цікавая група помнікаў другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя мае прыкметы неакласіцызму. Гэты накірунак быў папулярны ў Беларусі ў пачатку XX стагоддзя, прычым неакласічны дэкор "не выходзіў з моды" працяглы час — ён прымяняўся на тэрыторыі Заходняй Беларусі аж да 1930-х гадоў. Гэта можна патлумачыць моцнымі пазіцыямі, якія мела эстэтыка класіцызму ў нашай краіне раней, на мяжы XVIII—XIX стагоддзяў (стыль "ампір"). Праз сто гадоў вяртанне ў архітэктуру знаёмых форм, прыклады якіх сустракаюцца вельмі часта, успрымалася як належнае.

Пры вывучэнні помнікаў рэтраспектывізму студэнты прыходзяць да разумення як іх мастацкіх вартасцей, так і праблем гэтага творчага метаду. Нягледзячы на таленавітыя эксперыменты з гістарычнай спадчынай, ужо ў XIX стагоддзі стала відавочным, што арганічнае адраджэнне мінулых эпох і іх эстэтыкі немагчымае. На гэтым этапе, калі ў студэнтаў сфарміравалася глыбокае разуменне логікі мастацкіх працэсаў, яны гатовы засвоіць складаную эстэтычную праграму стылю "мадэрн". У якасці асноўных характарыстык стылю студэнты здольны заўважыць і выдзеліць не толькі дэкаратыўныя матывы (серпантынату, або "лінію ўдару біча", характэрныя элементы расліннага арнаменту і г. д.). Студэнты таксама самастойна прыходзяць да адкрыцця, што ў "мадэрне" важная свабодная кампазіцыя, што ў дэкоры гэтага стылю адыгрывае важную ролю фактура і натуральны колер матэрыялу. Іншае гучанне атрымліваюць таксама жывапісныя (мазаічныя) і скульптурныя дэталі.

Такім чынам, у межах дысцыплін гісторыка-мастацтвазнаўчага цыкла вывучэнне помнікаў эклектыкі, рэтраспектывізму, мадэрну, а таксама ўсяго кантэксту беларускай культуры другой палове XIX — пачатку XX стагоддзя дае магчымасць глыбокага аналізу мастацкіх працэсаў эпохі. Стылістыка гэтых помнікаў адлюстроўвае густы і культурную арыентацыю іх стваральнікаў і заказчыкаў, паказвае, якім шляхам ішло ў той час развіццё грамадства нашай краіны.

З такой пазіцыі помнікі рэтраспектывізму і мадэрну разглядаліся аўтарам у межах шэрага лекцыйных курсаў ("Гісторыя сусветнага мастацтва", "Гісторыя і тэорыя культуры Беларусі" для студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, спецкурс "Стылі ў мастацтве" для студэнтаў філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка). Як сведчыць вопыт работы, гэты падыход спрыяе больш поўнаму асваенню матэрыялу студэнтамі, развіццю ў іх навыкаў стылістычнага аналізу, фарміраванню глыбокага разумення сутнасці мастацкіх працэсаў у грамадстве.

---

[1] *Наливайко Д.* Искусство: направления, течения, стили. М., 1981. С. 38.
[2] Архітэктура Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 1993. С. 570.
[3] Тамсама. С. 259.
[4] *Кириченко Е. И.* Архитектурные теории XIX века в России. М., 1986. С. 9.
[5] *Лаўрэцкі Г. А.* Рэтраспектыўна-рускі стыль у архітэктуры Беларусі // Весці АН Беларусі: Сер. грамад. навук. 1993. № 1. С. 79—85.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ